**Палажэнне**
**аб адкрытым свяце керамічнай цацкі**
**“Гліняны цуд”**

Адкрытае свята керамічнай цацкі “Гліняны цуд” праводзіцца на базе дзяржаўнай установы дадатковай адукацыі “Цэнтр творчасці дзяцей і моладзі Салігорскага раёна” на сродкі гранта Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, выдзеленага педагогу дадатковай адукацыі Пратасене Мікалаю Аляксеевічу.

Арганізатары свята: ДУ “Мінскі абласны цэнтр народнай творчасці”; аддзел адукацыі, спорту і турызму Салігорскага райвыканкама; аддзел ідэалагічнай работы, культуры і па справам моладзі Салігорскага райвыканкама; грамадскае аб’яднанне “Беларускі Саюз майстроў народнай творчасці”, Мікалай Пратасеня – кіраўнік Заслужанага аматарскага калектыву Рэспублікі Беларусь студыі “Скарбонка”.

*Мэта:*

адраджэнне і захаванне ў сучасных умовах набыткаў традыцыйнай народнай культуры; выкарыстанне ва ўстановах культуры і адукацыі ў вучэбна-выхаваўчым працэсе тэхналогій стварэння твораў народных мастацкіх промыслаў, якія вылучаюцца яркай нацыянальнай самабытнасцю.

*Задачы:*

- прапаганда і папулярызацыя адной з цікавейшых з’яў народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва керамічнай цацкі, выхаванне патрыятычных адносін да гісторыка-культурнай спадчыны беларускага народу;
- вызначэнне стану і перспектыў развіцця гэтага віду мастацтва ў творчасці майстроў-педагогаў і іх навучэнцаў;
- народная традыцыйная цацка, яе сеняшні стан і далейшае развіцце (гістарычныя, тэхналагічныя, нацыянальныя асаблівасці);
- сучасная керамічная цацка ў творчасці дарослых і дзяцей, новыя формы і накірункі ў яе развіцці ў наш час;
- прымяненне народных тэхналогій ў дэкаратыўна-прыкладным мастацтве, іх зберажэнне і развіццё ў творчасці навучэнцаў устаноў культуры і адукацыі;
- развіццё творчых здольнасцей, мастацкага густу падрастаючага пакалення, выяўленне і падтрымка юных талентаў;
- заахвочванне дзяцей і моладзі да заняткаў традыцыйнымі рамёствамі, як адной з цікавейшых з’яў нацыянальнай культуры, да свядомага выбару будучай прафесіі;
- стымуляванне творчай актыўнасці і ўдасканаленне прафесійнага майстэрства кіраўнікоў творчых аб’яднанняў.

**Умовы правядзення адкрытага фестывалю керамічнай цацкі "Гліняны цуд"**

У свяце могуць удзельнічаць майстры, педагогі не залежна ад узросту, якія працуюць ва ўстановах культуры і адукацыі, якія ствараюць цацку, навучаюць гэтаму майстэрству дзяцей і моладзь. Кожны майстар удзельнічае са сваімі навучэнцамі (ад кожнага майстра не болей 1-2 навучэнцаў).

Майстар-педагог і яго навучэнцы прадстаўляюць на выставу калекцыю сваіх цацак у той намінацыі, або некалькіх намінацыях, у якіх яны працуюць. У час фестывалю майстар-педагог праводзіць майстар-клас са сваім навучэнцам па вырабу цацкі ў адной з намінацый (лепіць з гліны цацку). Пажадана правесці майстар-клас па дэкратыўнай апрацоўцы керамікі ў адной з тэхнік, раскрыць асаблівасці свайго творчага падыходу ў стварэнні цацкі. Гліну ўдзельнікам прадстаўляюць арганізатары фестывалю, а рабочы інструмент і дапаможныя матэрыялы, неабходныя для работы трэба мець уласныя.

На базе цэнтра адбудуцца майстар-класы па вырабу цацкі-свістулькі, цацкі-бразготкі, цацачнага посуду, па прымяненню народных тэхналогій дэкаратыўнай аздобы керамічных выяў. Пройдзе міні-конкурс па вырабу яйка-бразготкі сярод майстроў. У час фестывалю будзе працаваць ярмарка работ удзельнікаў свята. Пройдзе творчы абмен вопытам па пытаннях навучальнага працэсу ў мастацтве стварэнне глінянай цацкі.

Адкрыты фестываль "Гліняны цуд" праводзіцца для ўстаноў дадатковай адукцыі, устаноў культуры, майстроў, педагогаў, іх навучэнцаў, усіх тых, хто займаецца мастацтвам керамікі, стварае гліняную цацку. У апошнія дзесяцігоддзі гэты від мастацкага рамяства набывае асаблівую папулярнасць. Гэтаму садзейнічаюць фестывалі і конкурсы, якія праходзяць у нашай краіне, такія, як "Гліняны звон", "На аблоках дзяцінства", "Ганчарнае кола", конкурсы цацак у рамках міжнароднага фестывалю "Славянскі базар" у Віцебску, конкурс свістулькі "Салавейка" у рамках міжнароднага фестывалю "Дняпроўскія галасы ў Дуброўне", "Гліняны цуд" у Салігорску.

**Ацэнка работ і ўзнагароджванне**

Творчыя і тэхналагічныя магчымасці майстроў не абмяжоўваюцца. Пры падвядзенні вынікаў фестывалю журы будзе ўлічваць беражлівыя адносіны да традыцый, пачуццё меры, мастацкі ўзровень у выкананні народнай цацкі, творчыя прымяненні народных тэхналогій у мастацтве стварэння сучасных цацак; новыя пошукі і творчыя распрацоўкі.

**Намінацыі (творчыя майстэрні):**

- народная традыцыйная цацка-свістулька;
- гліняная цацка-бразготка;
- сучасная стылізаваная цацка – свістулька;
- цацкі-макеты (макеты архітэктурных будынкаў, тэхнікі і іншыя);
- сучасная цацка (вобразы нашага часу, дэкаратыўная пластыка);
- цацка, выкананая на ганчарным крузе (свістулькі, цацачны посуд, вадзяная цацка “салавейка”);
- сюжэтная цацка, цацка-кампазіцыя, што ўключае некалькі персанажаў; гліняная цацка арнітаморфнага характару (выявы птушак);
- гліняная цацка антрапаморфнага характару (выявы чалавека).

Журы ацэньвае калекцыю гатовых работ кожнага удзельніка. Практычны выраб цацкі ў адной з намінацый, асаблівасці тэхналагічнага працэсу майстар-класа, яго мастацкую вартасць.

Удзельнікі ўзнагароджваюцца спецыяльнымі дыпломамі ў розных намінацыях, каштоўнымі падарункамі і сувенірамі.

Дадатак 1

**Журы**
**адкрытага фестывалю-выстаўкі**
**“Гліняны цуд”**

1. Сахута Яўген Міхайлавіч – старшыня Беларускага Саюза майстроў народнай творчасці, прафесар, доктар мастацтвазнаўства, старшыня журы;
2. Раманенка Любоў Еўдакімаўна – кандыдат педагагічных навук, прафесар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтва;
3. Хачкова Вольга Барысаўна – загадчык аддзела традыцыйнага мастацтва дзяржаўнай установы “Мінскі абласны цэнтр народнай творчасці”;
4. Музычкіна Наталля Уладзіміраўна – метадыст дзяржаўнай установы адукацыі “Мінскі абласны інстытут развіцця адукацыі”

Дадатак 2

**Аргкамітэт адкрытага фестывалю-выстаўкі**
**“Гліняны цуд”**

1. Цыбулька Ігар Аляксандравіч – начальнік аддзела адукацыі, спорту і турызму Салігорскага райвыканкама;
2. Кірбай Таццяна Анатольеўна – начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Салігорскага райвыканкама;
3. Быліновіч Святлана Іванаўна– загадчык сектарам выхаваўчай работы аддзела адукацыі, спорту і турызму Салігорскага райвыканкама;
4. Хачкова Вольга Барысаўна – загадчык аддзела традыцыйнага мастацтва дзяржаўнай установы “Мінскі абласны цэнтр народнай творчасці”;
5. Харлапчук Тамара Мікалаеўна – выканаўчы дырэкттар грамадскага аб’яднання “Беларускі Саюз майстроў народнай творчасці”;
6. Колтун Сняжана Міхайлаўна – дырэктар дзяржаўнай установы дадатковай адукацыі “Цэнтр творчасці дзяцей і моладзі Салігорскага раёна”;
7. Дамалазава Ірына Міхайлаўна – загадчык аддзялення народнай творчасці дзяржаўнай установы дадатковай адукацыі “Цэнтр творчасці дзяцей і моладзі Салігорскага раёна”;
8. Пратасеня Мікалай Аляксеевіч – кіраўнік Заслужанага аматарскага калектыву Рэспублікі Беларусь студыі “Скарбонка”, народны майстар Беларусі, сябра Беларускага Саюза майстроў народнай творчасці.

**Праграма правядзення адкрытага фестывалю цацкі “Гліняны цуд”**
**г. Салігорск**

**Першы дзень**

- Рэгістрацыя ўдзельнікаў свята (вырашэнне арганізацыйных пытанняў).
- Адкрыццё свята: шэсце ўдзельнікаў свята з павозкай ганчара, які прадае свістулькі па вуліцах горада.
- Прадстаўленне ўдзельнікаў, падняцце ў неба цацкі (эмблемы, сімвалу фестывалю) на паветраных шарах.
- Размеркаванне ўдзельнікаў па намінацыях, майстар-класах.
- Творчыя майстар-класы па вырабу цацак, з выставай гатовых работ удзельнікаў свята.
- Конкурс па вырабу яйка-бразготкі.
- Святочны кірмаш. Канцэртная і гульнёвая праграма.
- Вячэра.

**Другі дзень**

- Сняданак.
- Творчыя майстар-класы па прымяненню старынных тэхналогій у стварэнні цацкі і іх выкарыстанню ў сучасных умовах.
- Абмеркаванне. Творчы абмен вопытам. Выступленні навукоўцаў і ўдзельнікаў. Прэзентацыя кнігі Праатасені М “Гліняная казка”.
- Экскурсія ў хату ганчара ў в. Саковічы. Майстар-клас у ганчарнай майстэрні.
- Абед.
- Падвядзенне вынікаў. Узнагароджванне ўдзельнікаў свята.
- Ад’езд.